УПРАЎЛЕННЕ ПА АДУКАЦЫІ, СПОРЦЕ І ТУРЫЗМЕ
БЯРЭЗІНСКАГА РАЙВЫКАНКАМА
ДЗЯРЖАЎНАЯ ЎСТАНОВА АДУКАЦЫІ
"СЯРЭДНЯЯ ШКОЛА №2 Г.БЕРАЗІНО"





# ДАВЕДНІК

адукацыйных экскурсійных маршрутаў

# КАМЯНІ ПАМЯЦІ

## По слядах габрэйскіх і татарскіх пахаванняў у Беразіно





Беразіно 2021

ГАЛОЎНАЕ ЎПРАЎЛЕННЕ ПА АДУКАЦЫІ
МІНСКАГА АБЛВЫКАНКАМА

УПРАЎЛЕННЕ ПА АДУКАЦЫІ, СПОРЦЕ І ТУРЫЗМЕ
БЯРЭЗІНСКАГА РАЙВЫКАНКАМА

Дзяржаўная ўстанова адукацыі
”Сярэдняя школа № 2 г.Беразіно“

**Рэспубліканскі конкурс**
«Дорогами знаний»

# КАМЯНІ ПАМЯЦІ:
# ПА СЛЯДАХ ГАБРЭЙСКІХ І ТАТАРСКІХ ПАХАВАННЯЎ У БЕРАЗІНО


Бурая Анастасія,
14 гадоў, 9 клас,
Радзевіч Аліна,
14 гадоў, 9 клас
Ждановіч А.Я.,
настаўнік мастацтва,
тэл. +375296772896,
Мікульчык М.А.,
педагог-арганізатар,
тэл. +375295717791


Беразіно, 2021

# ЗМЕСТ

АГУЛЬНЫЯ ЗВЕСТКІ ПРА ДАВЕДНІК ................................ 4

КАРОТКАЯ ІНФАРМАЦЫЯ ПРА БЕРАЗІНО ....................... 5

ПА СЛЯДАХ ГАБРЭЙСКІХ ПАХАВАННЯЎ У БЕРАЗІНО 7

БЯРЭЗІНСКІ МІЗАР ........................................................... 15

ЗНАКАМІТЫЯ ЎРАДЖЭНЦЫ БЕРАЗІНО .......................... 19

ІНТЭРАКТЫЎНАЯ ГУЛЬНЯ “ВУЛІЦЫ НАШЫХ ГАРАДОЎ” ............................................................................ 25

КАРЫСНАЯ ІНФАРМАЦЫЯ ............................................ 26

БУДЗЬЦЕ ЎВАЖЛІВЫМІ НА ДАРОЗЕ! .............................. 27

# АГУЛЬНЫЯ ЗВЕСТКІ ПРА ДАВЕДНІК

Габрэі і татары на працягу доўгага часу жылі ў горадзе Беразіно. Яны як прадстаўнікі неславянскага этнасу вызначаліся сваёй адметнай культурай, мовай, традыцыямі і звычкамі. Амаль адзінымі сведкамі прысутнасці габрэяў і татар у нашым горадзе на сённяшні дзень з'яўляюцца габрэйскія і татарскія пахаванні, прадстаўленыя невялікай колькасцю. У Беларусі, якая перажыла не адно варожае нашэсце, засталося не так многа аўтэнтычных помнікаў гісторыі і архітэктуры, з-за розных гістарычных абставін аказаліся занядбанымі ці пакінутымі і гэтыя пахаванні.

Памяць пра чалавека жыве да таго часу, пакуль жывуць людзі, якія яе захоўваюць. Пасля гэтага яго імя застаецца толькі ў гісторыі, а таксама на надмагільным помніку. Могілкі побач з агульначалавечымі каштоўнасцямі нясуць з сабой важны гістарычны, інтэлектуальны, адукацыйны і выхаваўчы патэнцыял.

Мы, аўтары гэтага даведніка, упэўненыя, што не толькі родныя памерлых або забітых адказныя за захаванне чалавечай памяці, але ўсе мы, бярэзінцы. Распрацаваныя намі экскурсійныя маршруты заклікаюць кожнага, хто адправіцца ў падарожжа, аддаць даніну памяці і павагі людзям, якія былі нашымі суседзямі, сябрамі, якія жылі і працавалі на бярэзінскай зямлі. Яны былі і застаюцца часткай гісторыі нашай краіны, якая заўсёды вызначалася разнастайнасцю нацыянальных культур, шматканфесійнасцю, талерантнасцю.

Даведнік будзе цікавым усім, хто імкнецца да вывучэння лёсу габрэйскіх і татарскіх пахаванняў у Беларусі, у тым ліку ў нашым раённым цэнтры.

У выданні прадстаўлены два асобныя маршруты, якія пры жаданні можна спалучыць у адзін, кароткая характарыстыка аб'ектаў, карысная інфармацыя і інш. звесткі ў форме QR-кодаў. У даведніку выкарыстаны ўласныя фота і фота з інтэрнэт-крыніц.

# КАРОТКАЯ ІНФАРМАЦЫЯ ПРА БЕРАЗІНО



Беразіно – адно са старажытных паселішчаў усходняй частцы Беларусі. Легенда пра паходжанне Беразіно апавядае пра маладых закаханых, якія выратаваліся ўцёкамі ад пярэваратняў у месцы, дзе ім здалося спакойна і светла, інакш кажучы “беразна”.

Мястэчка ўзнікла як гандлёва-рамесніцкі цэнтр на рацэ Беразіна, якая гістарычна з’яўляецца часткай вялікага воднага шляху “з вараг у грэкі”.

Першая пісьмовая згадка пра мястэчка Беразіно ў Любушанскім старостве Вялікага княства Літоўскага датуецца 1501 годам. У розныя часы яно належыла ўплывовым дзяржаўным дзеячам і магнатам Сапегам, Тышкевічам, Патоцкім. З 1668 г. Беразіно атрымала прывілей на штотыднёвы торг і штогадовы кірмаш.



З 1793 г. мястэчка Ігуменскага павета. Пачынаючы з ліпеня 1924 г. Беразіно ў розныя часы было цэнтрам раёна розных акругоў, уваходзіла ў склад Магілёўскай, затым Мінскай вобласці. У 1968 г. Беразіно – горад раённага падпарадкавання.



Турыстычнымі аб’ектамі ў Беразіно з’яўляюцца помнік архітэктуры перш. паловы XIX ст. сядзібны дом і спіртзавод, пабудаваныя ў перыяд валодання мястэчкам Ганнай Патоцкай-Вансовіч, якая пакінула нашчадкам мемуары пра жыццё вышэйшага света Польшчы і Францыі.

Унікальным турыстычным брэндам горада з'яўляецца Музей драўлянай лыжкі, у якім можна ўбачыць драўляныя



шэдэўры, выраблены майстрамі з розных рэгіёнаў Беларусі, а таксама Лыжку Цмока – самую вялікую драўляную лыжку ў свеце, створаную бярэзінскімі ўмельцамі.

За апошнія 2-3 гады вучнямі і педагогамі мясцовых устаноў адукацыі распрацавана некалькі экскурсійных маршрутаў: "Горад лыжкі над Бярэзінай", "Па святых месцах Бярэзінскага края", "Па храмах Бярэзіншчыны", прафарыентацыйны маршрут "Прамысловы турызм горада Беразіно".

У раёне адсутнічае гісторыка-краязнаяўчы музей, яго задачу па распаўсюджванні краязнаўчых ведаў выконвае школьны музей ДУА "Бярэзінская гімназія", школьныя краязнаўчыя гурткі, а таксама некалькі бярэзінскіх краязнаўцаў-аматараў.

Аднак усяго гэтага, на наш погляд, недастаткова, каб задаволіць патрэбы турыста, які імкнецца атрымаць цікавую, змястоўную інфармацыю пра развіццё рэгіёна ў розныя часы. Таму так важна папулярызаваць краязнаўчыя веды сярод дзяцей і моладзі, прыкладаць шмат намаганняў для развіцця адукацыйнага турызму. З гэтай мэтай і быў створаны наш даведнік.

***<u>Дадатковы матэрыял:</u>***

Э.Р.Іофе Тыповае мястэчка
(Маё мястэчка Беразіно)

*(убачыць матэрыял можна праз выкарыстанне мабільнага дадатка – сканера QR-кодаў)*

# ПА СЛЯДАХ ГАБРЭЙСКІХ ПАХАВАННЯЎ У БЕРАЗІНО

**Мэта экскурсіі:** паглыбленне краязнаўчых ведаў дзяцей і моладзі, выхаванне талерантнасці, адчування адзінства з прадстаўнікамі розных нацыянальнасцей і канфесій праз вывучэнне гісторыі роднага краю.

**Задачы экскурсіі:**

- азнаёміцца з мемарыяльнымі аб’ектамі на тэрыторыі г.Беразіно;
- даведацца ў час падарожжа па вызначаным экскурсійным маршруце пра адметныя, але малавядомыя старонкі развіцця горада ў розныя часы;
- прыцягнуць большую колькасць жадаючых да вывучэння краязнаўства.

**Узроставая катэгорыя:** 14 – 17 гадоў.

**Від экскурсіі:** пешаходна-веласіпедная.

**Час маршрута:** 2 гадзіны 30 хвілін.

**Працягласць:** 5 км.

**Сезоннасць праходжання маршрута**:
позняя вясна – ранняя восень.

**Нітка маршрута:** Вул. Камсамольская (№2) – завул. Кастрычніцкі (гарадскі парк, за будынкам №17) – вул. Паркавая – вул. Інтэрнацыянальная (хата № 75, ад яе на поўнач да перасячэння з вул. Чкалава магіла вязняў гета) – вул. Новабазарная – вул. Алешкевіча – вул. Піянерская – гарадскі парк (уздоўж вул. Савецкая) – вул. Мультана (гарадскія могілкі).

## Карта-схема:




## Вул. Камсамольская.



Да Вялікай Айчыннай вайны вуліца ўяўляла сабой тыповую гарадскую забудову з дашчатым тратуарам і брукаванкай.

Месца пражывання габрэяў у розныя часы.

Згодна з неаднаразовым перапісам насельніцтва, у Беразіно жыла пераважная колькасць габрэяў. Іх асноўны занятак – гандлёва-рамесніцкая дзейнасць. Сцвярджаюць, што вокны хат па вул. Камсамольская служылі

своеасаблівым латком па продажы тавараў, раніцай аканіцы расчыняліся ў час гандлю, нанач зачыняліся.

У мястэчку дзейнічалі сінагогі, габрэйскае вучылішча, некалькі прыватных прадпрыемстваў. Ажыццяўляўся значны тавараазварот. На сродкі габрэяў утрымлівалася бібліятэка.

**Дом № 2**.

Па неправераных звестках, усходняя частка сцяны – гэты рэшткі сінагогі, якая была разруйнавана ў гады Вялікай Айчыннай вайны.



У савецкія часы ў аднаўленым будынку знаходзілася дзіцячае кафэ "Бураціна" Бярэзінскага раённага спажывецкага саюза, у 2018 г. прыватная крама "Электратэхніка" (зачынена).

**Хата № 6.**

Да вайны належыла двум габрэйскім кавалям – братам Годэсам. Пазней пасля вяртання з эвакуацыі хату набыла сям'я Іофе (сярод якіх доктар гістарычных навук Э.Р.Іофе). У вялікай хаце было дзве рускія печкі. Аднак вытапіць іх было складана, таму сям'я пяцёра чалавек (бацькі і трое дзетак) жылі ў адным пакойчыку, узімку кур забіралі на кухню, дзе пад печчу быў куратнік.





**Завул. Кастрычніцкі.**



Старыя габрэйскія могілкі. Знаходзіліся на ўзвышэнні, згодна з уяўленнямі і верай габрэяў у тое, што першымі ўваскрэснуць пахаваныя на гары. (Найбольш вядомае ў свеце габрэйскае пахаванне знаходзіцца на Елеонскай, альбо Маслічнай гары ў Іерусаліме).

Могілкі былі вялікія, агароджаныя. Адзначаны на савецкіх ваенных мапах 1925 г.



У канцы чэрвеня 1941 г. тут высадзіўся нямецкі дэсант, які быў знішчаны супрацоўнікамі раённай міліцыі і НКУС, некалькі фашыстаў было ўзята ў плен.

У час вайны немцы, баючыся партызан, загадалі вялікія галіны дрэў зрэзаць, агароджу разламалі. Праз могілкі пачалі хадзіць.



Могілкі зараз не існуюць. У 1970-я гады былі знішчаны і пераўтвораны ў парк. На большай частцы тэрыторыі могілак знаходзіцца гарадская пажарная часць. Уздоўж бакавой алеі парка можна ўбачыць некалькі ацалелых мацэў (пахавальных камянёў), размешчаных адвольна, іншыя былі расцягнуты для ўласных патрэб або перавезены на гарадскія могілкі.

**Вул. Інтэрнацыянальная.**



Гістарычная назва Папоўшчына (на гэтай вуліцы жыў праваслаўны святар).

У час Першай рускай рэвалюцыі (1905-1907 гг.) 1 сакавіка 1905 г. каля 11 гадзін па гэтай вуліцы да канатнага завода Беркі Старобінца рухаўся натоўп з 70 чалавек у складзе маладых хлапцоў і дзяўчат ад 12 да 25 гадоў. Гэта былі памочнікі краўцоў, шаўцоў, панчошнікаў, якія вырашылі абвясціць забастоўку. Для падаўлення хваляванняў мінскі губернатар загадаў выслаць у мястэчка пол-эскадрона драгун.



У 1941 г. у час акупацыі Беразіно нямецка-фашысцкімі захопнікамі на вуліцы размяшчалася гета, куды сагналі ўсіх габрэяў горада, а мясцовых жыхароў адтуль выселілі ў габрэйскія хаты. Былі ўкопаны слупы, тэрыторыя была агароджана дротам.

**Хата № 75** (Хата на вул. Інтэрнацыянальная, куды зганялі ўсіх габрэяў з гета перад расстрэлам).



У снежні 1941 г. (па іншых звестках у лютым 1942 г.) з дамоў забралі мужчын (негабрэяў) і прымусілі недалёка ад канца вуліцы капаць вялікую чатырохкутную яму. Перад расстрэлам усіх габрэяў павыганялі з хат і прывялі да апошняй хаты на вуліцы (хата Аўчарэнка), дзе прымушалі людзей распранућца. Казалі, што шукалі схаваныя каштоўнасці ў валасах і на целе.

Пасля гэтага людзей выганялі да ямы, гналі па жывым калідоры з немцаў і паліцаяў, білі палкамі, ля ямы расстрэльвалі. Уся тэрыторыя вакол была ачэпленая. Грамадзянскія мужчыны, якія капалі ямы, стаялі ў баку з рыдлёўкамі, як ім сказалі.



Калі ўсіх расстралялі, рускіх мужчын, якія стаялі ў баку і ўсе бачылі, прымусілі яму закопваць. Адзін са сведкаў жудаснай трагедыі прызнаваўся, што зямля варушылася, там было шмат яшчэ напаўжывых, параненых. Мужчыны прыйшлі ўсе страшныя, чорныя ад перанесенага жаху.




**Магіла вязняў гета (вул. Інтэрнацыянальная, ад хаты № 75 на поўнач да перасячэння з вул. Чкалава).**

Усяго пахавана 940 чалавек, вядомыя імёны 268 чалавек. На магіле пастаўлены помнік, на якім змешчаны тэкст “Здесь покоится прах 940 граждан г.п.Березино, расстрелянных и замученных немецко-фашистскими захватчиками в 1942 г.”.





Ля помніка знаходзіцца некалькі мацаў (пахавальных камянёў, прывезеных з разбураных могілак яўрэяў).

**Дадатковы матэрыял:**

**Жыхары габрэйскай нацыянальнасці – ахвяры фашысцкага генацыду** *(убачыць іх імёны можна праз выкарыстанне мабільнага дадатка – сканера QR-кодаў)*

SCAN ME

**Вул Новабазарная.**

Да вайны, як і Інтэрнацыяльная, была значна карацейшая. Знаходзіцца побач з базарам, дзе ў савецкія часы ажыццяўляўся продаж сельскагаспадарчай прадукцыі, жывёл. Сёння тэрыторыя прыватнага прадпрыемства, крамаў, кафэ “Амадэус”.

**Вул. С.Аляшкевіча (р-н “Базарная горка”).**



Вуліца носіць імя Героя Савецкага Саюза Сцяпана Філімонавіча Аляшкевіча.

Нарадзіўся ў 1910 г. ў вёсцы Перавоз Бярэзінскага раёна.

На фронце з сакавіка 1943 г. Разведчык стралковага палка чырвонаармеец Аляшкевіч неаднаразова ўдзельнічаў у вайсковых разведвальных аперацыях. 13 сакавіка 1944 г. вызначыўся пры фарсіраванні ракі Паўднёвы Буг у раёне сяла Ладыжын (цяпер горад у Вінніцкай вобласці). У складзе разведгрупы Аляшкевіч у ліку першых пераправіўся праз раку і ўступіў у бой з моцнымі сіламі праціўніка за пашырэнне плацдарма, чым садзейнічаў паспяховай пераправе падраздзяленняў палка.



Загінуў 4 мая 1944 г. ў тыле ворага пасля выканання аперацыі па выбуху моста на рацэ Малдова ў Румыніі. Пахаваны ў населеным пункце Вама (Румынія).

За ўзорнае выкананне баявых заданняў і праяўленыя адвагу і геройства чырвонаармейцу С.Ф.Аляшкевічу прысвоена званне Героя Савецкага Саюза (пасмяротна). У в. Чыжаха Бярэзінскага раёна ў яго гонар усталяваны помнік.

**Вул. Піянерская (да перасячэння з вул. Савецкая, праз гарадскі парк).**



Гістарычная назва Паложынская (у напрамку в. Паложына). Адна са старых вуліц горада. Захавалася паштоўка з выявай вуліцы. Унікальная тым, што на сённяшні дзень на адной вуліцы знаходзіцца праваслаўная царква і касцёл, што сведчыць пра мірныя добрасуседскія адносіны паміж прадстаўнікамі розных веравызнанняў.

**Вул. Мультана**.



Гістарычная назва Жорнаўская (у напрамку в.Жорнаўка). Носіць імя Героя Савецкага Саюза Мікалая Мультана, які вызваляў Беразіно ў 1944г.

Габрэйскія пахаванні на тэрыторыі гарадскіх могілак. Ад цэнтральнага ўвахода каля 170 м наперад (прыкладна 200 крокаў), затым налева і да агароджы гарадскіх могілак. Каля 100 пахаванняў, якія адносяцца ў асноўным да 1945-1965 гг. Частка надпісаў на помніку зроблена на дзвюх мовах (рускай і ідзіш). Ёсць некалькі мацэў, перавезеных са старых габрэйскіх могілак.





# БЯРЭЗІНСКІ МІЗАР

**Мэта экскурсіі:** паглыбленне краязнаўчых ведаў дзяцей і моладзі, выхаванне талерантнасці, адчування адзінства з прадстаўнікамі розных нацыянальнасцей і канфесій праз вывучэнне гісторыі роднага краю.

**Задачы экскурсіі**:

- азнаёміцца з мемарыяльнымі аб’ектамі на тэрыторыі г.Беразіно;
- даведацца ў час падарожжа па экскурсійным маршруце пра адметныя, але малавядомыя старонкі развіцця горада ў розныя часы;
- прыцягнуць большую колькасць жадаючых да вывучэння краязнаўства.

**Узроставая катэгорыя:** 14 – 17 гадоў.

**Від экскурсіі: пешаходна-веласіпедная.**

**Час маршрута:** 50 хвілін.

**Працягласць:** 3 км.

**Сезоннасць прахаджэння маршрута:** позняя вясна – ранняя восень.

**Нітка маршрута:** Вул. Кастрычніцкая (“Турэцкая, альбо Татарская Горка” ля хаты № 78) – 3-і завул. Мультана – вул. Мультана (да дома № 100) татарскія могілкі (на тэрыторыі прыватнага прадпрыемства).

**Карта-схема:**



**Вул. Кастрычніцкая.**



Цэнтральная вуліца горада. Гістарычная назва Ігуменская, пазней Чэрвеньская (адзін з завулкаў так і называецца дагэтуль Чэрвеньскім). Яна пачыналася прыкладна ад вінакурні (спіртзавода) і заканчвалася каля так званай Турэцкай гары (Татарскай горкі) - ад хаты № 78 і вышэй па вуліцы на поўнач (у раёне Сярэдняй школы № 2).

Горка была ў свой час досыць вялікая, пасля падсыпкі дарогу паднялі. Хата № 78 у даўнейшыя часы (прыкладна да пачатку 2000-х гадоў) была на адным узроўні з праезнай часткай.



Існуе некалькі тлумачэнняў, адкуль пайшла назва гары. Тут маглі жыць татары. Так яе маглі назваць салдаты, якія вярнуліся з руска-турэцкай вайны і пасяліліся на суседняй вуліцы, якую сталі называць Салдацкая (зараз Чырвонаармейская). У любым выпадку, назвай Турэцкая (ці Татарская) беларусы хацелі падкрэсліць выключнасць, нетыповасць для гэтай мясцовасці такой вялізнай гары на аснове супрацьпастаўлення: свой свет (зразумелы) і чужы свет (іншы, турэцкі, татарскі (абодва цюрскія народы, роднасныя).

**Вул.Мультана (каля дома № 100). Татарскія пахаванні (мізар).**

Знаходзяцца на тэрыторыі прыватнага прадпрыемства (раней райзагатпрама) ў правы бок ад цэнтральнага ўвахода (ля старожкі неабходна спытаць дазволу для наведвання).



У 2018 г. сіламі мясцовага бізнэсмена С.Лапыцькі тэрыторыя добраўпарадкаваная, умоўная мяжа праведзена высаджанымі туямі. Захавалася два помнікі-камяні. На іх звесткі пра памерлых прыводзяцца на дзвюх мовах (рускай і татарскай), уверсе помнікаў выява зоркі і паўмесяца. Выразна чытаюцца прозвішча аднаго памерлага (Хасеневіч) і дата смерці .



Акрамя таго, вядома імя аднаго з пахаваных на мізары. Гэта Аляксандр Якаўлевіч Ждановіч, нарадзіўся ў 1897 г. у г.п.Беразіно. Працаваў у райзагатканторы. У другім шлюбе з Фёклай Васільеўнай Смольскай (у дзяв. Баркоўскай.

Нявестка Аляксандра Якаўлевіча (замужам за яго сынам Якавам) – Ганна Аляксандраўна Ждановіч (у дзяв. Ладуцька), заснавальніца музея драўлянай лыжкі, стваральніца Бярэзінскага народнага клуба майстроў, працавала метадыстам, пазней намеснікам дырэктара раённага дома культуры, першым дырэктарам Бярэзінскага

раённага цэнтра рамёстваў. Памёр А.Я.Ждановіч у снежні 1961 г. Пахаваны на мізары, справа ад устаноўленых помнікаў каля агароджы.



*А.Я.Ждановіч*
*другі рад справа*



ПАСВЕДЧАННЕ АБ ШЛЮБЕ
СВИДЕТЕЛЬСТВО О БРАКЕ

ПЯ № 248794

Грамадзянін / Гражданин: Жданович Александр Яковлевич
год нараджэння / год рождения: 1897 г.
месца нараджэння / место рождения: г.п. Березино Березинского р-на Минской об.
і грамадзянка / и гражданка: Соловьёва Фекла Васильевна
год нараджэння / год рождения: 1916 г.
месца нараджэння / место рождения: д. Старый ... Богушевский район Витебской об.
уступілі ў шлюб / вступили в брак: 27/XI-1940 ...
двадцать седьмого ... тысяча девятьсот ...
1940 год ноября

*Пасведчанне аб шлюбе з датай і месцам нараджэння А.Я.Ждановіча і пасведчанне аб нараджэнні Я.А.Ждановіча з адзнакай аб нацыянальнасці “татарын” у графе “Бацькі”*



ПАСВЕДЧАННЕ АБ НАРАДЖЭННІ
СВИДЕТЕЛЬСТВО О РОЖДЕНИИ

Гр. Жданович (прозвішча — фамилия)
Яков Александрович (імя і імя па бацьку — имя и отчество)
нарадзіўся(лася) / родился(лась): 19/VII-1952 г. девятнадцатого июля тысяча девятьсот пятьдесят второго года (прапісам і лічбамі год, месяц і чысло — прописью и цифрами год, месяц и число)
Месца нараджэння дзіцяці: горад, сяло / Место рождения ребенка: город, село: Березино
раён / район: Березинский
вобласць / область: Минская
аб чым у кнізе запісаў актаў грамадзянскага стану аб нараджэнні / о чем в книге записей актов гражданского состояния о рождении
1952 года / года июля месяца / месяца 30 чысла / числа
утвораны адпаведны запіс за / произведена соответствующая запись за № 69

БАЦЬКІ: / РОДИТЕЛИ:
Бацька / Отец: Жданович (прозвішча — фамилия)
Александр Яковлевич (імя і імя па бацьку — имя и отчество)
нацыянальнасць / национальность: татарин
Маці / Мать: Жданович (прозвішча — фамилия)
Фекла Васильевна (імя і імя па бацьку — имя и отчество)
нацыянальнасць / национальность: белорусска
Месца рэгістрацыі / Место регистрации: Березинский рай бюро ЗАГС Минской обл.
Дата выдачы: 30 июля 1952 г.

ВЫДАН ПАСПОРТ СЕРИИ ... 572773 от 28/VIII ...

ПЭ № 971781

Загадчык бюро запісаў актаў грамадзянскага стану / Заведующий бюро записей актов гражданского состояния

# ЗНАКАМІТЫЯ ЎРАДЖЭНЦЫ БЕРАЗІНО

## АЛЯКСАНДР ПАРВУС



Ізраіль Лазаравіч Гельфанд (псеўданім Аляксандр Львовіч Парвус) нарадзіўся 27 жніўня [8 верасня] 1867 г. у сям’і габрэя-рамесніка ў Беразіно Мінскай губерні.

У дзяцінстве хата Гельфандаў згарэла ў страшным пажары ў час габрэйскага пагрому. Сям’я перабралася ў Адэсу, дзе хлопчык скончыў гімназію. У 1887 г. паступіў у Базэльскі ўніверсітэт, які скончыў у 1891 г. і атрымаў званне доктара філасофіі.

Адораны шматлікімі талентамі і высокай працаздольнасцю, мала вядомы эмігрант з доктарскай ступенню, ён стаў знакамітым журналістам. Займаў актыўную палітычную пазіцыю. Дзеяч рускага і германскага сацыял-дэмакратычнага руху, тэарэтык марксізму, публіцыст, быў добра знаёмы з рускім пісьменнікам М.Горкім, палітыкамі Ул.Леніным, Р.Люксембург, Л.Троцкім і інш.

Калі пачалася першая руская рэвалюцыя 1905-1907 гг., Парвус апынуўся ў Расіі, узначаліў “Рускую газету”, тыраж якой павысіўся з 30 тыс. да паўмільёна. Пасля падаўлення рэвалюцыі, Парвус апынуўся ў турме Петрапаўлаўскай крэпасці, і затым атрымаў 3 гады высылкі. Калі яму ўдалося збегчы з этапа ў Сібіры, ён вярнуйся ў Еўропу і напісаў кнігу “У рускай Бастыліі”, якая стала бестсэлерам.

Фінансаваў рускую рэвалюцыю.

Памёр 12 снежня 1924 г. у Берліне.

# ХАНА РОВІНА



Нарадзілася ў Беразіно Ігуменскага павета Мінскай губерні ў 1892 г. ў сям'і Давіда і Сары-Рыўке Рубінаў.

Вучылася ў Варшаве, працавала ў дзіцячым садку. З 1914 года на тэатральнай сцэне.

Адна з заснавальнікаў старэйшага ізраільскага рэпертуарнага тэатра «Габіма», які выступаў з гастроялмі ў Еўропе і ЗША.

Вучаніца вядомых рускіх рэжысёраў Канстанціна Станіслаўскага і Яўгенія Вахтангава. У 1922 г. Я.Вахтангаў паставіў спектакль «Гадзібук» паводле п'есы Анскага з Ханой Ровінай у галоўнай ролі.

З 1918 па 1926 гг. Х.Ровіна ў складзе тэатра «Габіма» працавала ў Маскве.

З 1928 г. жыла ў Эрэц-Ісраэль. У гады Другой сусветнай вайны яна выступала перад салдатамі Яўрэйскай брыгады ў Егіпце і Еўропе і на падпольных сходах «Хаганы». Крытыкі адзначалі, што яе гульня была перапоўненая спагадай да кожнай гераіні, а майстэрства было прыкметна нават у дэталях.

Будучы вядучай актрысай тэатра, яна выконвала толькі галоўныя ролі ў спектаклях "Вечная песня" (1914), "Баль ля вытокаў" (1918). Самая знакамітая роля Леі з «Гадзібука». Знялася ў кінастужцы «Сабра» («Цабар») (рэж. Аляксандр Форд, 1933). Апошні раз на сцэну «Габімы» яна выйшла ў 1977 г. у ролі герцагіні Ёркскай ў спектаклі «Рычард III» паводле У.Шэкспіра.

Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Ізраіля (1956).

Дачка - актрыса і спявачка Ілана Ровін (1934-2020).

Памерла 2 лютага 1980 г. у Тэль-Авіве (Ізраіль).

# ІЛЬЯ ЯФІМАВІЧ ІЗГУР



Нарадзіўся 16 мая 1881 г. у Беразіно Мінскай губерні.

Малодшы сын пекара. Займаўся самаадукацыяй. Хацеў паступіць у гімназію ў Варшаве (але царскім указам было забаронена прымаць габрэяў у гімназіі).
У гэты час ён пачынае цікавіцца палітычнай барацьбой за правы габрэйскага народа. Пасля нядоўгага арышту, вяртаецца ў Беразіно, дзе адкрывае грамадскую бясплатную бібліятэку і разгортвае вялікую культурна-асветніцкую працу сярод яўрэйскай моладзі.

У 1903 годзе ў Варшаве, пазней у Вільні пачынае займацца літаратурнай творчасцю. Шмат пісаў пра рабочым руху і жыцця яўрэйскіх рабочых.

Перад першай сусветнай вайной у 1918-1920 і пазней, у 20-х гадах, пераязджае ў Беларусь, а затым пераязджае ва ўкраінскі горад Крэменчуг, дзе займаецца літаратурнай і асветніцкай дзейнасцю, працуе ў рэдакцыі газеты «Прыдняпроўскі голас», прымае актыўны ўдзел у грамадскім жыцці горада.

Член цэнтральнага камітэта Таварыства эсперантыстаў Украіны (1928) *(Эсперанта – мова для зносін прадстаўніоў розных нацыянальнасцей- заўв. аўтараў).* Як эсперантыст прымаў удзел у выданні «Вялікага руска-эспэранцкага слоўніка» (Масква, 1933).

Аўтар твораў «Бяссонныя ночы» (1910), «Смерць» (1915), «Песня песняў» (1919), «Няхай будзе святло!» (1920), «Je la Nomo de l'Vito» ( «Ад імя жыцця», Парыж 1926), «Nur Volu!» («Толькі хачу!», Лейпцыг, 1924; Парыж, 1927) і інш.

У час сталінскіх рэпрэсій расстраляны ў Кіеве
3 верасня 1937 года.

# МАРЫЯ ВЕНІЯМІНАЎНА БЯРКОВІЧ



Нарадзілася 26 снежня 1910 года ў мястэчку Беразіно Мінскай губерні.

У 1930 г. скончыла Віцебскі мастацкі тэхнікум, 1939 г. – Маскоўскі інстытут выяўленчых мастацтваў. Дыпломная праца – ілюстрацыі да аповесці Шолам-Алейхем "Хлопчык Мотл" (аўталітаграфіі).

У рэспубліканскіх, мастацкіх выставах удзельнічае з 1927 г.

У час Вялікай Айчыннай вайны працавала, у асноўным, у галіне ілюстрацыі.

Пачынаючы з 1954 года, працуе мастаком па касцюму на кінастудыі "Беларусьфільм".

Выканала эскізы касцюмаў да кінафільмаў "Несцерка" (1954 г.), "Міколка-паравоз" (1956 г.), "Чырвонае лісце" (1958 г.), "Апавяданні пра юнацтва" (1959 г.), "Апошні хлеб" (1963 г.), "Запомнім гэты дзень" (1966 г.), "Шчаслівы чалавек" (1969 г.) і інш.

Сярод яе твораў ёсць і лірычныя пейзажы, серыя лістоў у тэхніцы акварэлі і гуашы на вытворчую тэму: "Барысаўская запалкавая фабрыка імя С.М.Кірава "(1949 г.) і інш.

Памерла 19 жніўня 1993 г. у Мінску.

# РЫГОР ЛАЗАРАВІЧ СТАРОБІНЕЦ



Нарадзіўся 14 мая 1910 г. у г.Беразіно Мінскай губерні.

Пасля заканчэння Барысаўскага педагагічнага тэхнікума з 1929 г. працаваў настаўнікам у няпоўнай сярэдняй школе г.п.Халопенічы, Мінскай вобласці.

У 1932 г. Р.Л.Старобінец паступіў на хімічны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, а пасля заканчэння навучання ў 1937 годзе – у аспірантуру пры ўніверсітэце па спецыяльнасці "фізічная і калоідная хімія". У 1940 г. ён паспяхова абараніў дысертацыю на суісканне вучонай ступені кандыдата хімічных навук і пачаў працаваць ва ўніверсітэце дацэнтам кафедры фізічнай і калоіднай хіміі.

У гады Вялікай Айчыннай вайны з 1943 па 1945 гады Р.Л.Старобінец служыў у дзеючай арміі хімікам-разведчыкам, а пасля дэмабілізацыі вярнуўся на працу ва ўніверсітэт.

У пасляваенныя гады Рыгор Лазаравіч выканаў цэлы шэраг глыбокіх даследаванняў. З 1956 па 1989 гг. – загадчык кафедрай аналітычнай хіміі БДУ. У 1956 г. Р. Л.Старобінец арганізаваў і ўзначаліў працу лабараторыі па даследаванні іонаабменных працэсаў у Інстытуце агульнай і неарганічнай хіміі АН БССР.

Ён аўтар больш за 400 навуковых публікацый, больш за 60 аўтарскіх пасведчанняў. Пад яго кіраўніцтвам выканана і абаронена больш за 40 кандыдацкіх дысертацый; чатыры яго вучня падрыхтавалі і абаранілі доктарскія дысертацыі. Актыўна займаўся грамадскай дзейнасцю. Мае шматлікія ўзнагароды.

# ЭМАНУІЛ РЫГОРАВІЧ ІОФЕ



Нарадзіўся ў 1939 годзе у г. Беразіно Мінскай вобласці. У 1961 г. скончыў гістарычны факультэт БДУ, пазней Нацыянальны інстытут гуманітарных навук Республікі Беларусь па спецыяльнасці «паліталогія» і Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы і гуманітарнай адукацыі па спецыяльнасці «сацыялогія», доктар гістарычных навук, прафесар. Працаваў завучам сярэдняй школы, выкладчыкам тэхнікума. З 1978 года па цяперашні час працуе ў БДПУ імя М.Танка, чытае курсы паліталогіі, сацыялогіі і «Асновы ідэалогіі беларускай дзяржавы».

Са снежня 1993 па 2015 гг. – прафесар кафедры паліталогіі і права. З верасня 2015 г. – прафесар кафедры сацыяльна-гуманітарных дысцыплін. З 2011 г. Э.Р.Іофе – член Савета па абароне кандыдацкіх дысертацый па гістарычных навуках пры БДПУ імя М.Танка. Аўтар каля 2000 друкаваных прац, у тым ліку больш 40 кніг, апублікаваных за мяжой. Ён сябар Беларускага саюза журналістаў, член праўлення рэспубліканскага гістарычнага таварыства і рэспубліканскага фонду «Трасцянец», член рэдкалегіі часопіса «Веснік Брэсцкага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта», навуковы кансультант часопіса "Народная асвета". Мае шэраг узнагарод.

Родны брат Саул – вопытны геолаг, дарожны будаўнік, займаў адказныя высокія пасады. За сваю працоўную дзейнасць яму прысуджана званне “Ганаровы дарожнік БССР”, пазней “Ганаровы дарожнік Рэспублікі Беларусь”. Стаяў ля вытокаў стварэння музея гісторыі дарожнай гаспадаркі “Белдарбуд”. Аўтар некалькі кніг вершаў.

# ІНТЭРАКТЫЎНАЯ ГУЛЬНЯ
# “ВУЛІЦЫ НАШЫХ ГАРАДОЎ”



У 2016 г., дзякуючы Іне і Віктару Яўмененка, у Беразіно была праведзена кампанія “Вуліцы нашых гарадоў”. На хатах па вуліцах: Кастрычніцкая, Мультана, Чырвонаармейская, Інтэрнацыянальная, Савецкая, Піянерская, – былі размешчаны шыльды, на якіх разам з сучаснай змешчана гістарычная назва вуліцы, ёсць выява герба горада.







**У час падарожжа паспрабуйце адшукаць тыя шыльды, якія сустрэнуцца на маршруце! Зрабіце сэлфі! Поспехаў!**

***Падказка!!!***

***Вы адшукаеце шыльду***




- на вуліцы Інтэрнацыянальная на хаце, нумар якой у суме роўны 5;
- на вуліцы Кастрычніцкая на хаце амаль насупраць крамы, у якой раней была гарадская лазня;
- на вуліцы Савецкая ля парка побач з пешаходным пераходам;




- на вуліцы Мультана на ўстанове, якая ў сваёй назве мае лічбу 2.



# КАРЫСНАЯ ІНФАРМАЦЫЯ

**Грыль-бар “Мандарын”**
**Вул. М.Горкага, 48**
**(2-і паверх аўтавакзала)**
**Тэл. 8044754 92 95**

SCAN ME






**Гасцініца і рэстаран**
**“Бярэзіна”**
**Вул. Кастрычніцкая, 20,**
**Тэл. 8 01715 55-367**
**8 01715 55-739**

**Кафэ "Бярэзіна"**
**Вул. Хонінава, 3**







**Супермаркет”Трыа”**
**Вул.Хонінава, 3 а**

# БУДЗЬЦЕ ЎВАЖЛІВЫМІ НА ДАРОЗЕ!
## ПРАВІЛЫ ДАРОЖНАГА РУХУ ДЛЯ ПЕШАХОДАЎ І ВЕЛАСІПЕДЫСТАЎ

***Усім, хто адправіцца ў падарожжа, трэба памятаць правілы дарожнага руху. Нагадаем некаторыя з іх!***

Пешаход абавязаны рухацца па тратуары, пешаходнай або веласіпеднай дарожцы, а пры іх адсутнасці — па ўзбочыне (насустрач руху транспартных сродкаў). Не забывайце пра неабходнасць пазначыць сябе святлоадбівальным элементам у цёмны час сутак.

Перамяшчэнне ажыццяўляецца калонай не больш чым па двое дзяцей у радзе ў суправаджэнні паўналетніх з разліку не менш за аднаго суправаджальніка на дваццаць дзяцей. Рух на веласіпедзе павінен ажыццяўляцца па веласіпеднай дарожцы, а пры яе адсутнасці – па ўзбочыне, тратуары або пешаходнай дарожцы, не ствараючы перашкоды для бяспечнага руху пешаходаў (у адзін рад не далей за 1 метр ад яе правага краю).

Калоны веласіпедыстаў пры руху па праезнай частцы дарогі павінны быць падзелены на групы не больш чым па 10 веласіпедыстаў. Адлегласць паміж групамі павінна складаць не менш за 100 метраў. Пры перасячэнні праезнай часткі дарогі па пешаходным пераходзе веласіпедыст павінен весці веласіпед побач з сабой.

Веласіпедысту забараняецца выкарыстоўваць тэхнічна няспраўныя веласіпеды, рухацца, не трымаючыся за руль і (або) не трымаючы ногі на педалях.

Забараняецца без суправаджэння паўналетняй асобы кіраваць веласіпедам на дарозе асобам, маладзейшым за чатырнаццаць гадоў (акрамя пешаходных і жылых зон, тратуараў, веласіпедных і пешаходных дарожак.

***Жадаем вам лёгкага падарожжа і цікавых уражанняў!***

# ДЛЯ ЗАЎВАГ

Дзяржаўная ўстанова адукацыі
”Сярэдняя школа № 2 г.Беразіно“

# ДАВЕДНІК
адукацыйных экскурсійных маршрутаў

**Аўтары:**

Бурая Анастасія, 14 гадоў, 9 клас
Радзевіч Аліна, 14 гадоў, 9 клас
Ждановіч А.Я., настаўнік мастацтва 2 кат.,
бакалаўр педагагічных навук,
Мікульчык М.А., педагог-арганізатар

**Адрас:**

вул. Мультана, 19, 223311,г.Беразіно,

Мінская вобласць,

Рэспубліка Беларусь

Тэл. + 8 (01715) 65457

https://berezino2.schools.by